# Карніловіч Эдуард Аляксандравіч
# (1936-2020)



Карніловіч Эдуард Аляксандравіч — гісторык, публіцыст, пісьменнік.

Нарадзіўся 5 красавіка 1936 года ў вёсцы Любанічы Талачынскага раёна Віцебскай вобласці. Член КПСС з 1963 года. Скончыў Воранцэвічскую сярэднюю школу.

У 1965 годзе скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна, затым аспірантуру пры Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Працаваў рэдактарам, старшым рэдактарам маладзёжных праграм Беларускага тэлебачання (1962–1964гг.), інструктарам Мінскага абкама ЛКСМБ (1964–1966гг.), загадчыкам кабінета філасофіі і навуковага камунізму, выкладчыкам Беларускага тэхналагічнага інстытута імя С.М.Кірава (1966–1971гг.).

З 1971 года — старшы выкладчык, дацэнт кафедры навуковага камунізму Беларускага інстытута народнай гаспадаркі імя В.У. Куйбышава.

Кандыдат гістарычных навук з 1971 года.

Усё сваё жыццё ён быў у пошуку. Сфера навуковых інтарэсаў: удзел ураджэнцаў Беларусі ў дзяржаўным кіраванні і рэвалюцыйным руху ў царскай Расіі, гісторыя айчыннай і замежнай палітычнай, геапалітычнай і прававой думкі, біяграфіі беларускіх палітычных дзеячаў ХХ стагоддзя. Адзін з аўтараў падручніка па паліталогіі.

Аўтар кніг: “Платон Галавач — публіцыст” (разам з Р.В. Булацкім, 1973г.), “Рэвалюцыяй прызваныя” (1980г.), “Людзі рэвалюцыйнага подзвігу” (1985г.), “На грэбні гісторыі”, “Імёны з небыцця” (2003г.), “Генерал славянскай расы” (2007г.), “Беларусь: сузор’е палітычных імёнаў” (2009г.), “Ля вытокаў эканамічных ведаў”.

Складальнік зборнікаў успамінаў ураджэнцаў Беларусі пра У.І. Леніна “Правадыр, настаўнік і сябра” (разам з Э.А. Забродскім, 1980г.; 2 выд. 1985г.), успамінаў ураджэнцаў Беларусі пра Кастрычніцкую рэвалюцыю “У жалезных батальёнах рэвалюцыі” (разам з Э.А. Забродскім, 1987г.).

У 2009 годзе пабачыла свет яго новая фундаментальная праца — кніга “Беларусь: сузор'е палітычных імёнаў”.

Вучоны даследаваў 639 імёнаў і, што знамянальна, звыш 20 з іх — ураджэнцы нашага раёна.

Цяжка пераацаніць дапамогу, якую пісьменнік аказваў рэдакцыі раённай газеты “Наша Талачыншчына”. Менавіта ён адшукаў у архівах першыя нумары раённай газеты “Чырвоны хлебароб” за 1931г., 1932г., 1935г., дапамог атрымаць яе ў электроннай версіі. Менавіта ён даў нам шырокія матэрыялы пра нашых землякоў, якія працавалі і цяпер працуюць на касманаўтыку, ракетна-касмічную галіну СССР, а цяпер і Расіі. Менавіта ён падрыхтаваў дзевяць вялікіх раздзелаў для першага выдання кнігі “Памяць. Талачынскі раён”, а таксама рыхтаваў матэрыялы для яе другога выдання.

Яго першы нарыс аб школьным тэатры ў вёсцы Любанічы, адкуль ён родам, быў апублікаваны яшчэ ў 1954 годзе.

Эдуард Карніловіч прызнаны адным з лепшых аўтараў часопісаў “Работніца і сялянка” (1987г.) і “Беларуская думка” (2003г.). Апошнія гады свайго жыцця пражыў у адзіноце ў Мінску.

Памёр Эдуард Аляксандравіч Карніловіч у снежні 2020 года. Пахаваны на Радзіме, ў вёсцы Любанічы Талачынскага раёна Віцебскай вобласці.





63.3(4Беи)
К67

Э. А. Корнилович
А. Г. Корнилович

Рыцари открытий

В Науке • Технике • Культуре
Уроженцы Беларуси
1941 – 1953

Сотрудникам Толочинской районной библиотеки с наилучшими пожеланиями от автора
Э. Корнилович
6 июля 2017 г. Толочин.

Минск
«Альфа-книга»
2017

Толочинская ЦБС
1/М 109065

# Дадатковыя матэрыялы
# аб жыцці і дзейнасці:

**Кнігі (аўтар – Э.А. Карніловіч):**

1. **Белорусская дипломатия** : для среднего и школьного возраста / авт. А.Ю. Жерносек, Э.А. Корнилович и [др.]. — Минск : Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. — 48 с. : ил. — (История для школьников).
2. **В железных батальонах революции** : воспоминания уроженцев Беларуси — активных участников Великой Октябрьской социалистической революции / сост. Э.А. Корнилович, Э.А. Забродский. — Минск : Беларусь, 1987. — 174 с.
3. **Імёны з небыцця** / Эдуард Карніловіч. — Мінск : Беларусь, 2003. — 315 с. : іл.
4. **Беларусь: созвездие политических имён** : историко-биографический справочник / Эдуард Корнилович. — Минск : ФУАинформ, 2009. — 408 с. : ил.
5. **Генерал славянской рати** / Эдуард Корнилович. — Минск : Беларусь, 2007. — 190 с. : ил.
6. **На гребне истории** / Эдуард Корнилович. — Минск : Беларусь, 1989. — 240 с. : ил.
7. **От солдата да маршала** : Землю берегли родную. Несли победы свет / Эдуард Корнилович. — Минск : Колорград, 2018. — 504 с. : ил.
8. **Революцией призванные** / Эдуард Корнилович. — Минск : Беларусь, 1980. — 205 с. : ил.
9. **Рыцари открытий** : В науке. Технике. Культуре. Уроженцы Беларуси 1941–1953 / Эдуард Корнилович, Андрей Корнилович — Минск : Альфа-книга, 2017. — 472 с. : ил. — (Забытая Беларусь).
10. **Рыцари открытий** : Лауреаты Сталинских премий – уроженцы Беларуси 1941–1953 / Эдуард Корнилович, Андрей Корнилович — Минск : Альфа-книга, 2016. — 472 с. : ил. — (Забытая Беларусь).

**Артыкулы з перыядычных выданняў (аўтар – Э.А. Карніловіч):**

1. **Гісторыя Беларусі ў асобах** / Эдуард Карніловіч // Наша Талачыншчына. — 2013.— 11 верасня.— С. 7.
2. **Кавалер ордена Славы** / Эдуард Корнилович // Наша Талачыншчына. — 2012.— 8 мая. — С. 2.
3. **Мы рождены, чтоб сказку сделать былью** / Эдуард Корнилович// Наша Талачыншчына. — 2011.— 8 кастрычніка.— С. 6.
4. **Один из той шеренги** / Эдуард Корнилович // Наша Талачыншчына. — 2012.— 8 мая.— С. 2.
5. **Он создал “Мир” и “Союз”** / Эдуард Корнилович // Наша Талачыншчына. — 2011.— 26 чэрвеня. — С. 6.
6. **Пісьменнікі майго раёна** / Эдуард Карніловіч // Наша Талачыншчына. — 2013.— 7, 10 жніўня.— С. 3.
7. **Потомок Друцких князей** / Эдуард Корнилович // Наша Талачыншчына. — 2006.— 25 лістапада.— С. 4.
8. **Стала его судьбой** / Эдуард Корнилович // Наша Талачыншчына. — 2011.— 9 сакавіка.— С. 3.
9. **Спектакль начинается с декораций** / Эдуард Корнилович// Наша Талачыншчына. — 2016. — 6 студзеня.— С. 14.
10. **Чекист из Нарцизово** / Эдуард Корнилович // Наша Талачыншчына. — 2009.— 8 мая.— С. 4.

**Аб ім:**


1. **Бирюков, В.** Встреча, которая поможет нам сделать свои открытия / Виктор Бирюков // Наша Талачыншчына. — 2017. — 15 ліпеня. — С. 8.
2. **Бирюков, В.** С любовью о своих земляках / Виктор Бирюков // Наша Талачыншчына. — 2012. — 1 верасня. — С. 4.
3. **Королёв, М.** Постижение прошлого / Михаил Королёв // Наша Талачыншчына. — 2011. — 28 октября. — С. 2.
4. **Королёв, М.** Плеяда новых имён / Михаил Королёв // Наша Талачыншчына. — 2012. — 8 верасня. — С. 5.
5. **Сучасныя беларускія краязнаўцы** // Краязнаўчая газета. — 2006. — 12снежня. — С. 2.
6. **Эдуард Александрович Корнилович** // Моя Толочинщина: страницы истории / Анатолий Шнейдер. — 2-е изд, с изм. — Минск : Бизнесофсет, 2006. — С. 154.
7. **Эдуард Аляксандравіч Карніловіч** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал.: І.П. Шамякін [і інш.]; мастак А.М. Хількевіч. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1988. — С. 643.